3. *Мусин, И. А.* Язык дирижерского жеста / И. А. Мусин. – М. : Музыка, 2007. – 232 с.
4. *Сергеенкова, В. В.* Управляемая самостоятельная работа студентов. Модульно-рейтинговая и рейтинговая системы / В. В. Сергеенкова. – Минск : РИВШ, 2005. – 131 с.

**С. В. Зыгмантовіч,**
*загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# АКТЫЎНЫЯ МЕТАДЫ ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНАЙ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ БІБЛІЯТЭЧНЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучасная канцэпцыя развіцця вышэйшай адукацыі арыентуе на абнаўленне прафесійнай адукацыі на кампетэнтнаснай аснове шляхам узмацнення яе практычнай накіраванасці пры захаванні фундаментальнасці [2].

У сістэме вышэйшай адукацыі існуе некалькі падыходаў да практыка-арыентаванай адукацыі. Адны аўтары (Ю. Вятроў, Н. Клушына) звязваюць яе з арганізацыяй вучэбнай, вытворчай і пераддыпломнай практыкі студэнта. Іншыя (П. Абразцоў, Т. Дзмітрыенка) неабходнасць яе ўкаранення бачаць у фарміраванні значных для будучай прафесійнай дзейнасці якасцей асобы, а таксама ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных у практычнай прафесійнай дзейнасці. Некаторыя аўтары (А. Вярбіцкі, Я. Плотнікава, В. Шаршнева і інш.) станаўленне практыка-арыентаванай адукацыі звязваюць з выкарыстаннем магчымасцей кантэкстнага (прафесійна накіраванага) вывучэння профільных і няпрофільных дысцыплін. Ф. Г. Ялалаў лічыць, што для пабудовы практыка-арыентаванай адукацыі неабходны новы, дзейнасна-кампетэнтнасны падыход [3]. Неабходна прызнаць, што ўсе названыя падыходы не з’яўляюцца ўзаемавыключальнымі і могуць ляжаць у аснове праектавання і рэалізацыі задач падрыхтоўкі сучасных бібліятэчных спецыялістаў.

Распрацаваныя і прынятыя адукацыйныя стандарты для падрыхтоўкі спецыялістаў па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія», тыпавыя навучальныя планы, а таксама праграмы выкладаемых навучальных дысцыплін пабудаваны

на сучасных метадалагічных пазіцыях з улікам рэалізацыі дзейнасна-кампетэнтнаснага падыходу, які знаходзіць сваё адлюстраванне як у мэтах, задачах падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, так і ў пераліку выкладаемых дысцыплін, змесце, формах, метадах навучання і кантролю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

Праектаванне вучэбнага працэсу з боку выкладчыка базіруецца на асноўных кампанентах сістэмна-дзейнаснага падыходу, заснаванага на абавязковай рэалізацыі матывацыйна-каштоўнаснага, мэтавага, аперацыянальна-тэхналагічнага і выніковага аналізу кампанентаў праектнай (вытворчай) вучэбнай дзейнасці. Змястоўная трансфармацыя навучальнага працэсу, арыентаваная на развіццё студэнта, прадугледжвае як засваенне зместу пэўных навучальных дысцыплін, так і актывізацыю яго самастойнай пазнавальнай дзейнасці. У працэсе выкладання спецыяльных бібліяграфічных дысцыплін ставіцца задача сфарміраваць не толькі прафесійныя ўменне і навыкі, але і такія якасці, як прафесійная адказнасць, шматварыянтнасць мыслення, здольнасць да творчага вырашэння задач, уменне працаваць у калектыве, камунікатыўныя здольнасці і навыкі прафесійных зносін.

Практыка-арыентаваны характар выкладання спецыяльных бібліяграфічных дысцыплін знаходзіць адлюстраванне і ва ўсё больш шырокім выкарыстанні актыўных і інтэрактыўных форм правядзення заняткаў.

Актыўнае навучанне – гэта пастаяннае ўзаемадзеянне паміж выкладчыкам і студэнтам з выкарыстаннем такіх форм, якія забяспечваюць рэалізацыю ўнутранага механізму самаразвіцця навучэнцаў. Яно прадугледжвае выкарыстанне сістэмы метадаў, накіраваных галоўным чынам на самастойнае авалоданне студэнтамі ведамі і ўменнямі ў працэсе актыўнай разумовай і практычнай дзейнасці.

Актыўнае навучанне заснавана на ўзаемнай зваротнай сувязі паміж студэнтам і выкладчыкам. Яно дазваляе неадкладна і своечасова даць ацэнку дзеянням навучэнцаў, вынікам і іх наступствам, а таксама атрымаць інфармацыю пра неабходнасць унясення дапаўненняў і змяненняў у метадычнае забеспячэнне навучальнага працэсу.

Эфектыўнасць у засваенні навучальнага матэрыялу пры выкарыстанні актыўных метадаў пацвярджаецца вынікамі экс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перыментальных даследаванняў. Навучэнцы захоўваюць у памяці 10 % таго, што чытаюць, 20 % таго, што чуюць, 30% таго, што бачаць, 50 % таго, што чуюць і бачаць. У той жа час пры актыўным успрыманні інфармацыі яны ўтрымліваюць у памяці 80 % таго, што казалі самі і 90 % таго, што рабілі самі [1].

У класіфікацыі актыўных форм навучання вылучаюцца неімітацыйныя і імітацыйныя (гульнявыя і негульнявыя) тэхналогіі навучання. У працэсе выкладання дысцыпліны «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы» у мэтах фарміравання практыка-арыентаваных кампетэнцый выкарыстоўваюцца ролевыя і дзелавыя гульні, трэнінгі, рашэнне вытворчых задач – метад кейсаў, дыялогава-дыскусійныя метады, навучанне ў парах, падрыхтоўка мерапрыемстваў для канкрэтных мэтавых груп карыстальнікаў, індывідуальныя заданні, арыентаваныя на стымуляванне інтэлектуальнага і асобаснага станаўлення студэнтаў.

Кейс-метад – разбор канкрэтных сітуацый. Ён дапаўняе многія мэтавыя аспекты вучэбнай дысцыпліны шляхам увядзення практычных задач; актыўна выкарыстоўваецца пры фарміраванні ў студэнтаў навыкаў даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання: навыкаў аналізаваць запыты, вызначаць іх тып, вылучаць пошукавыя прыкметы, складаць пошукавае прадпісанне, выконваць запыты з выкарыстаннем канкрэтных даведачна-бібліяграфічных рэсурсаў, з якімі працуюць бібліятэкі. У працэсе правядзення гэтых заняткаў выкладчыкам ставіцца мэта: навучыць будучых бібліятэкараў выконваць разавыя запыты на прафесійным узроўні (выкарыстоўваць усе магчымыя рэсурсы для задавальнення запыту, булевые аператары пры фарміраванні пошукавага вобраза запыту, магчымасці пашыранага пошуку, ацэнкі знойдзеных дакументаў і г. д.).

Ролевыя гульні – гэта актыўны метад навучання, які выкарыстоўваецца ў навучальным працэсе і будуецца на засваенні роляў «бібліёграф – спажывец даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання», «бібліёграф – абанент індывідуальнага бібліяграфічнага інфармавання» у працэсе фарміравання навыкаў і гатоўнасці будучых бібліятэкараў ажыццяўляць розныя віды бібліяграфічнага абслугоўвання.

Практыка выкарыстання дзелавых гульняў як мадэлі ўзаемадзеяння навучэнцаў у працэсе дасягнення мэт, якія імітуюць рашэнне комплексных вытворчых задач, звязана з арганіза-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыяй і ўзнаўленнем у навучальным працэсе такіх форм бібліяграфічнай дзейнасці, як «Дзень спецыяліста», «Дзень бібліяграфіі».

Па метаду праектаў ідзе праца па тэмах дысцыпліны «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы», звязаных з падрыхтоўкай бібліяграфічных дапаможнікаў, навігатараў па інтэрнэт-рэсурсах, прэзентацый па рэкламе бібліяграфічных прадуктаў і паслуг.

Сучасныя педагагічныя тэхналогіі патрабуюць ад выкладчыка ўменн канструяваць заняткі, ствараць асаблівае педагагічнае асяроддзе, у якім магчыма рэалізацыя актыўных метадаў навучання. На факультэце актыўна выкарыстоўваюцца магчымасці вучэбна-навукова-вытворчых комплексаў, звязаныя з правядзеннем заняткаў на базе бібліятэк, выкарыстаннем іх рэсурснай базы, вызначэннем змястоўных аспектаў выканання работ у адпаведнасці з рэальнымі патрэбамі практыкі. Прымяненне Інтэрнэту, сайтаў бібліятэк значна пашырыла магчымасці выкарыстання нарматыўнай дакументацыі бібліятэк, іх рэсурснай базы, працы ў вучэбнай аўдыторыі з рэальнымі даведачнымі, бібліяграфічнымі рэсурсамі рэгіянальных, рэспубліканскіх, замежных бібліятэк. Павышэнню выніковасці актыўных форм навучання спрыяе і такая мэтавая накіраванасць навучальных заняткаў, як падрыхтоўка бібліяграфічных прадуктаў для выкарыстання ў практыцы бібліятэк, у вучэбным працэсе.

Сярод напрамкаў удасканалення практыка-арыентаванай падрыхтоўкі будучых бібліятэкараў можна вылучыць наступныя: павелічэнне колькасці бібліяграфічных дысцыплін за кошт прапаноў дысцыплін па выбары, дысцыплін спецыялізацый; устанаўленне міждысцыплінарных кантактаў у сувязі з выкладаннем на розных кафедрах і стварэнне міжкафедральнай дысцыплінарна-метадычнай камісіі па бібліяграфічных дысцыплінах; арыетацыя бібліяграфічнай падрыхтоўкі падчас вытворчай практыкі на стварэнне студэнтамі рэальных бібліяграфічных прадуктаў і паслуг (у апошнія гады яна ў большай ступені носіць азнаямленчы характар); падрыхтоўка вучэбна-метадычных комплексаў па бібліяграфічных дысцыплінах з сучаснай методыка-дыдактычнай кампанентай.

Выкарыстанне актыўных метадаў навучання ў адукацыйным працэсе прад'яўляе новыя патрабаванні і да выкладчыка, сярод



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якіх свабоднае валоданне вучэбным матэрыялам і ўменне прымяняць яго ў залежнасці ад сітуацыі і катэгорыі навучэнцаў; высокі ўзровень вучэбна-метадычных уменняў і навыкаў, якія дазваляюць рыхтаваць разнастайныя навучальныя матэрыялы; кваліфікаванае валоданне інфармацыйнымі тэхналогіямі.

1. *Байтусова, И. Е.* Активные методы обучения в высшей школе / И. Е. Байтусова, Е. Н. Новохатская, Э. М. Тасбулатова // Архив научных публикаций [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.rusnauka.com/32_DWS_2008/ Pedagogica/ 36620.doc.htm. – Дата доступа: 28.11.2013.

2. Государственная программа развития высшего образования на 2011–2015 годы: постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 01.07.2011, № 893 // Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.pravo.by/world_of_law/text. asp? RN=C21100893. – Дата доступа: 07.12.2013.

3. *Ялалов, Ф. Г.* Деятельностно-компетентностный подход к практико-ориентированному образованию / Ф. Ялалов // Центр дистанционного образования [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.eidos.ru/journal/2007/0115-2.htm. – Дата доступа: 11.01.2014.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**П. Г. Игнатович,**
*профессор кафедры культурологии,*
*кандидат исторических наук,*
*профессор*

## СОЦИОЛОГИЧЕСКОЕ МЫШЛЕНИЕ КАК ВАЖНЕЙШИЙ ФАКТОР ПОДГОТОВКИ СОВРЕМЕННОГО СПЕЦИАЛИСТА

Специалист любой сферы деятельности, если он хочет быть успешным, должен владеть не только профессиональными знаниями и навыками, но хорошо ориентироваться в явлениях общественной жизни, в поведении людей. Он сам должен быть социализированным индивидом, готовым психологически, нравственно и когнитивно к успешному выполнению социальных ролей в семье, трудовом коллективе, воинском подразделении, спортивной команде и т. д., а также исполнению гражданских обязанностей и гражданского долга.

В системе научного знания социологии отведено особое место. Она единственная из наук, изучающая общество в целом.